**З'езд пісьменнікаў**




# Спачатку было слова

**У Мінску ў Белдзяржфілармоніі прайшоў Другі з'езд Саюза пісьменнікаў Беларусі. У гэтым высокім творчым форуме прыняла ўдзел і дэлегацыя Магілёўскай вобласці *(на фота)*, у складзе якой – супрацоўнікі газеты «Магілёўскія ведамасці» празаікі Яўген Булава і Аляксандр Цярахаў.**

Прывітанне ўдзельнікам з'езда накіраваў Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка.

На ім разглядаліся актуальныя пытанні працы Саюза пісьменнікаў у цэлым і літаратараў у прыватнасці, якія ў першую чаргу грунтуюцца на патрыятызме, праўдзівасці, шчырасці, сумленнасці...

Прагучалі тэзісы аб больш уважлівых адносінах да творчай моладзі, актывізацыі аўтараў, якія пішуць для дзяцей, аб больш пільнай увазе да беларускай мовы.

На з'ездзе быў абраны старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі – гэта пасада зноў засталася за нястомным Мікалаем Чаргінцом.

У мерапрыемстве прымалі ўдзел таксама прадстаўнікі літаратурных аб'яднанняў з Расіі, Азербайджана, Літвы, Чэхіі і Сірыі.

Дарэчы, вельмі красамоўнымі выглядалі словы вядомага азербайджанскага пісьменніка Чынгіза Абдулаева: «Вы ведаеце, больш за 29 мільёнаў маіх кніг прададзены ва ўсім свеце. У іх ёсць розныя героі – дрэнныя азербайджанцы, дрэнныя рускія, немцы, англічане. Але ніколі – беларусы. Я проста не ўяўляю сабе дрэннага беларуса! Сябры, заставайцеся такімі заўсёды!»

Зал, стоячы, гучнымі апладысментамі адгукнуўся на гэтыя шчырыя словы, бо менавіта літаратура – адзін з асноўных сродкаў, якія дазваляюць выканаць такое пажаданне.

* * *

Сваімі ўражаннямі аб з'ездзе з намі падзяліліся ўдзельнікі магілёўскай дэлегацыі.

**Уладзімір ДУКТАЎ, старшыня Магілёўскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі:**

«Вельмі добра, што на з'ездзе былі абазначаны галоўныя кірункі нашай творчай дзейнасці, якая, безумоўна, прывядзе да з'яўлення яшчэ больш якасных літаратурных твораў. Наша Магілёўскае аддзяленне заўсёды рупіцца аб захаванні літаратурнай і культурнай спадчыны, якая засталася ад папярэднікаў... Дзяржаўнае фінансаванне і арганізацыйная дапамога дазволілі выдаць сацыяльна значныя творы шэрагу сяброў аддзялення, у іх ліку кнігі мастацкай прозы, паэзіі, публіцыстыкі Міколы Барысенкі, Івана Пехцерава, Міколы Салаўцова, Ніны Кавалёвай, Міколы Лёўчанкі, Аляксандра Балдоўскага. З'езд даў нам дадатковы імпульс».

**Аляксандр БАЛДОЎСКІ, празаік:**

«Мяне вельмі задаволіла канструктыўная аператыўная работа з'езда. Усё было добра арганізавана. Упэўнены, што гэта станоўча паўплывае на нашу творчую працу».

**Віктар КУНЦЭВІЧ, паэт:**

«Добра, што на з'ездзе прагучала многа планаў на перспектыву. Цяпер галоўнае, каб яны здзейсніліся. А яшчэ дадам: пасля такіх мерапрыемстваў заўсёды адчуваеш жаданне працаваць больш плённа, менавіта я атрымаў творчы штуршок».

**Мікалай БАРЫСЕНКА, празаік:**

«Задаволены работай з'езда, магчымасцю сустрэцца са сваімі калегамі з іншых рэгіёнаў Беларусі... Адчуваю другое, а мо, і трэцяе дыханне. І галоўнае ў нашай далейшай працы – работа з моладдзю. Толькі тады, калі яна будзе прафесійнай і шчырай, у нас з'явяцца новыя Быкавы, Мележы... А гэта абавязкова здарыцца. Я ўпэўнены».

*Сяргей НОВІКАЎ.*